# САДРУЖНАСЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

***А. І. Голубева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

8 снежня 2011 г. спаўнясцца 20 гадоў са дня ўтварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Згодна з ч. 1 арт. 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх.

8 снежня 1991 г. кіраўнікі Беларусі – Станіслаў Шушкевіч, Расіі – Барыс Ельцын і Украіны – Леанід Краўчук у Віскулях падпісалі Пагадненне «Аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў», вядомае ў гісторыі як Белавежскае Пагадненне. У дапаўненне да Пагаднення кіраўнікі дзяржаў падпісалі заяву. У Пагадненні і заяве былі названы наступныя прычыны ўтварэння Садружнасці: выхад рэспублік са складу Саюза ССР; утварэнне незалежных дзяржаў; недальнабачная палітыка цэнтра, якая прывяла да глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу; узрастанне сацыяльнай напружанасці ў многіх рэгіёнах СССР; гістарычная агульнасць народаў і інш. Устаноўчымі актамі СНД з'яўляюцца: Пагадненне «Аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў» (08.12.1991), Пратакол да Пагаднення «Аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў» (21.12.1991), Алма-Ацінская дэкларацыя (21.12.1991).

Арганізацыйны этап утварэння СНД завяршыўся 22 студзеня 1993 г. прыняццем Устава Садружнасці. Усе дзяржавы-члены з'яўляюцца самастойнымі суб'ектамі міжнароднага права, хаця Садружнасць не з'яўляецца дзяржавай і не валодае наднацыянальнымі паўнамоцтвамі. Устаў замацаваў асноўныя мэты, прынцыпы і сферу сумеснай дзейнасці дзяржаў – членаў СНД. На сённяшні дзень застаецца праблемным пытанне вызначэння міжнародна-прававога статусу СНД. На думку аўтара, Садружнасць з'яўляецца разнавіднасцю міждзяржаўнага ўтварэння, якое носіць канфедэратыўны характар. У Садружнасці могуць ствараццa і наддзяржаўныя органы, але хутчэй за ўсе, не для кіравання, а для каардынацыі дзеяння дзяржаў.

Канфедэрацыя – гэта тэрміновае аб'яднанне дзяржаў, якое пасля дасягнення пастаўленай мэты прыпыняе сваe існаванне, або на працягу

часу можа трансфармавацца ў федэрацыю. Магчыма пры ўтварэнні СНД разлічвалі на доўгатэрміновае існаванне аб'яднання, на ўзнікненне доўгатэрміновых адносін паміж дзяржавамі ў эканамічнай, палітычнай і іншых сферах.

Узаемадзеянне краін ажыццяўляецца праз каардынуючыя органы СНД. Усяго ў рамках Садружнасці створана 82 органы, у тым ліку 66 органаў галіновага супрацоўніцтва. У рамках СНД дзейнічаюць наступныя органы: Савет кіраўнікоў дзяржаў, Савет кіраўнікоў урадаў, Савет міністраў замежных спраў, Міжпарламенцкая Асамблея, Эканамічны Суд і інш.

Згодна з рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД «Аб удасканаленні і рэфармаванні структуры органаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў» Выканаўчы Сакратарыят СНД, апарат Міждзяржаўнага эканамічнага Камітэта Эканамічнага саюза, працоўныя апараты міждзяржаўных і міжурадавых галіновых органаў былі рэарганізаваны ў адзіны пастаянна дзеючы выканаўчы, адміністрацыйны і каардынуючы орган – Выканаўчы камітэт Садружнасці. У цяперашні час у склад СНД уваходзіць 11 дзяржаў з 15 рэспублік былога СССР. Вылучаюць наступныя катэгорыі дзяржаў – удзельніц СНД: дзяржавы-заснавальнікі, дзяржавы-члены, асацыяваныя члены, дзяржавы-назіральнікі.

Пытанні перспектыўнага развіцця СНД актыўна абмяркоўваюцца на навуковых канферэнцыях. Так, 28–29 верасня 2011 г. у Мінску адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «20 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў». 4 кастрычніка 2011 г. ў штаб-кватэры Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц СНД адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Содружество Независимых Государств: достижения, проблемы, перспективы». На наш погляд, найбольш перспектыўным і эфектыўным з'яўляецца супрацоўніцтва ў фарміраванні і развіцці агульнай эканамічнай прасторы дзяржаў – удзельніц СНД.